Да 50-годдзя Савецкай улады

# ВЁСКА, У ЯКОЙ Я НАСТАЎНІЧАЎ

Ішоў 1924 год. Была восень. Кастрычнік. Я толькі што дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі і шукаў, распытваў у людзей дарогу на Вялічкавічы, куды быў накіраван настаўнікам.

Ужо за Старобінам мяне сустрэў зялёны лес, напоены моцным грыбным пахам. Праз колькі кіламетраў хады — вёска Паварчыцы. Адсюль прама цераз балота, перарэзанае канавамі, і ляжаў шлях на Вялічкавічы — невялікую вёсачку, загубленую сярод балот і лясоў.

Цераз балота патрэбна было ісці без дарогі. Дарога ў вёску ўстанаўлівалася толькі з прыходам зімы. Тады вялічкаўцы запасаліся на лета соллю, запалкамі і іншымі неабходнымі рэчамі. І сядзелі, зноў чакаючы надыходу зімы.

Выйшаўшы за вёску, я ўбачыў сінеючую палоску лесу і два высокія дубы.

— На дубы не ідзіце, — параілі мне ў Паварчыцах, — а то трапіце за граніцу.

Я ведаў, што непадалёку ад Вялічкавіч — дзяржаўная граніца з Польшчай, што за вёскай — пагранічная застава. Узабраўся на стог, убачыў некалькі пабудоў і ўзяў на іх кірунак. Мяне спаткаў вартаўнік і правёў да Вялічкавіч.

Іду вузкай вясковай вуліцай, па абодва бакі якой туляцца маленькія хаткі з падслепаватымі акенцамі. Людзі ў лапцях, у зрэбных паляшуцкіх кашулях, але ветлівыя і цікаўныя. Іх непасрэдная шчырасць мне адразу спадабалася.

— Настаўнік прыехаў! — разнеслася па вёсцы. Мяне абступіла дзетвара.

Усёй вёскай дапамаглі знайсці хату пад клас. Прыслалі дзяцей. Яны нясмела таўкліся ля парога, прыглядаючыся да свайго настаўніка.

Работу пачаў з двума класамі адразу. А на наступны год адзін вучань быў падрыхтаваны за трэці клас. Вясной, па пояс у балотнай вадзе, я разам з ім ішоў у Старобін, дзе ён павінен быў здаваць экзамены. Гэта быў Тарасевіч Рыгор — мой першы выпускнік, першы пісьменны чалавек з Вялічкавіч.

Жыццё гэтай вёскі пачынала паступова наладжвацца. Была створана камсамольская арганізацыя. Мне разам з начальнікам заставы і яго памочнікам прыходзілася даволі часта праводзіць з насельніцтвам гутаркі, чыткі газет.

Зямлі ў вялічкаўцаў было мала, ды і тая на пясчаных узгорках. Хлеб даволі часта замяняла бульба. Зімой жыхары вёскі палявалі на дзіч, а летам лавілі ўюноў і сушылі іх на зіму. Жыццё карэнным чынам перайначала, калі ў вёсцы быў створан калгас.

Моцна пацярпелі Вялічкавічы ў перыяд фашысцкай акупацыі. Жыхары вёскі актыўна дапамагалі партызанам. Карнікі поўнасцю спалілі вёску і многіх яе жыхароў. Толькі тым, хто схаваўся ў лесе, удалося выратавацца ад фашысцкай навалы.

Не пазнаць Вялічкавіч сёння. Яны ўваходзяць у адзін з буйнейшых калгасаў раёна — «Бальшавік». Вёска нанава адбудавана. Тут ёсць магазін, лячэбны пункт, пачатковая школа. У дамах — багацце і дастатак. Многія жыхары набылі матацыклы. З вёскі выйшлі ўрачы, настаўнікі, інжынеры, камандзіры Савецкай Арміі.

Вось і нядаўна мне зноў захацелася пабываць у Вялічкавічах. На пасадачнай пляцоўцы аўтастанцыі ў Салігорску я сеў у аўтобус і праз колькі гадзін быў у Вялічкавічах. Вёску не пазнаць, як не пазнаць і тых палешукоў, якіх мне давялося вучыць грамаце.

Вялікія змены прынёс нам Кастрычнік. Яго святло ярка зазззяла над кожнай вёскай.

**А. ЗАЛАТАРЭВІЧ,**
**настаўнік-пенсіянер.**